■ Канферэнц-зала

ПРА ДЫЯЛОГ КУЛЬТУР І ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ СМІ

20 лютага Інстытут журналістыкі БДУ праводзіць міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Міжнародная журналістыка –2014: дыялог культур і ўзаемадзеянне медыя розных краін». Яна прысвечана 70-годдзю з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 70-годдзю стварэння факультэта журналістыкі БДУ і 30-годдзю пачатку работы кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры. Напярэдадні канферэнцыі наш карэспандэнт сустрэўся з загадчыкам кафедры, доктарам навук, прафесарам Таццянай ДАСАЕВАЙ.

— Таццяна Мікалаеўна, чым выкліканы вялікі інтарэс да канферэнцыі з боку беларускіх і замежных удзельнікаў?

— Ідэя правесці на базе нашай кафедры канферэнцыю па міжнароднай праблематыцы ўзнікла тры гады таму. Яе рэалізавалі спачатку ў якасці пілотнага праекта — хацелі паглядзець, як на прапанаваную намі тэму сучаснага стану і развіцця міжнароднай журналістыкі адгукнуцца навукоўцы, аналітыкі медыясферы, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі Беларусі і замежных краін. Даследаванні супрацоўнікаў кафедры, іх багаты досвед падказвалі, што такая дыскусія наспела. Сёння людзі паўсюдна ўсё больш усведамляюць уплыў глабальных падзей у свеце на іх жыццё. Яны, натуральна, хочуць дакладна ведаць, што насамрэч адбываецца ў далёкай Сірыі і блізкай Украіне. Гэта, у сваю чаргу, павышае цікавасць і патрабавальнасць чытачоў, радыёслухачоў і тэлегледачоў як у цэлым да міжнароднай журналістыкі, так і да тых канкрэтных СМІ, якія надаюць увагу асвятленню рэзанансных падзей, аператыўнай інфармацыі з «гарачых кропак» планеты. Невыпадкова ці не ўсе аўтарытэтныя выданні працягваюць сачыць за ходам развіцця сітуацыі вакол кіеўскага Майдана.

— І якія былі вынікі першай канферэнцыі?

— Зборнік дакладаў і выступленняў яе ўдзельнікаў, атрымаў рэзананс за межамі Беларусі. Поспеху садзейнічала і тое, што наш Інстытут журналістыкі падтрымалі рэктарат БДУ, Міністэрства адукацыі і Міністэрства інфармацыі, Беларускі саюз журналістаў, рэдакцыі вядучых СМІ краіны. Хачу адзначыць, што задумка правядзення канферэнцыі належала дацэнту нашай кафедры Барысу Залескаму, у недалёкім мінулым журналісту-міжнароднику. У многім дзякуючы яго арганізацыйным здольнасцям і намаганням тая першая канферэнцыя аказалася ўдалай.

Ужо другая канферэнцыя, якая адбылася летась, таксама выклікала вялікую цікавасць з боку беларускіх і замежных даследчыкаў тэорыі і практыкі міжнароднай журналістыкі. Між іншым, яны з прыемнасцю адзначалі, што ў час рэгістрацыі атрымалі загадзя выдадзены зборнік матэрыялаў канферэнцыі. Час паказаў яго запатрабаванасць. Ён карыстаецца попытам у навукоўцаў, аспірантаў, студэнтаў не толькі Інстытута журналістыкі БДУ.

— Наколькі, на ваш погляд, актуальная тэматыка цяперашняй канферэнцыі?

— Мяркую, што дыялог культур і ўзаемадзеянне СМІ розных краін — якраз тое, чаго сёння не хапае ў поўнай меры народам не толькі тых краін, што аказаліся ўцягнутымі ў разбуральныя канфлікты. Дыялог патрэбны ўсім. Паглядзіце, прычыны непаразуменняў і канфліктаў часам вельмі розныя, але іх наступствы амаль заўсёды аднолькавыя: хаос палітычнага і грамадскага жыцця, эканамічны заняпад, рэзкае пагаршэнне жыццёвага ўзроўню пераважнай часткі насельніцтва, падзенне маралі і г. д. Таму тэма аднаго з дакладаў канферэнцыі прысвечана аналізу інфармацыйных прычын міжнародных канфліктаў XXI стагоддзя.

Увогуле, тэматыка канферэнцыі разнастайная: шляхі ўваходжання беларускай журналістыкі ў сусветны інфармацыйны кантэкст, Мытны саюз у люстэрку беларускай і замежнай прэсы, магчымасці ўзаемадзеяння масмедыя і еўрапейскі вектар знешняй палітыкі Беларусі, роля СМІ ў прасоўванні інтарэсаў беларускай дзяржавы на міжнароднай арэне і інш. Гасцей чакаем з Санкт-Пецярбурга, Ніжняга Ноўгарада, Цюмені, Запарожжа, Паўладара.

Дарэчы, канферэнцыя садзейнічае стварэнню айчыннай школы сіналогіі — кітаязнаўства. Кітайскі навуковец Хунянь Юй разважае аб аспектах фарміравання іміджу яго краіны ў свеце. Беларускі кітаязнавец Вераніка Карлюкевіч даследуе тэндэнцыі развіцця кітайскай літаратурнай перыёдыкі ва ўмовах рынку. Міхаіл Валькоўскі — медыйныя фактары стварэння Беларуска-кітайскага індустрыяльнага парка пад Мінскам. Цікавымі абяцаюць быць даклады Эль-Сір Халіда, іншых замежных удзельнікаў.

Гутарыў Леанід ТУГАРЫН.

■ Лавіся, рыбка!..

НА ЛЁД — ПА АЗАРТ, УЛОЎ І ЗДАРОЎЕ!

22 і 23 лютага ў Беларусі пройдзе XI чэмпіянат свету па лоўлі рыбы на мармышку з лёду. У міжнародных спаборніцтвах возьмуць удзел аматары зімняй рыбалкі з 14 краін свету. Сярод удзельніц будзе і зборная Беларусі, якая з'яўляецца дзейным чэмпіёнам свету па гэтай дысцыпліне. Дарэчы, летась беларускі спартсмен Юрый Шчорс заняў першае месца ў асабістым заліку чэмпіянату свету.

Сваім меркаваннем наконт першынства падчас прэс-канферэнцыі падзяліўся **віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі рыбалоўнага спорту ў прэснай вадзе Ігар ЧЫНЯКОЎ:** «З 2007 года чэмпіянаты па гэтым відзе рыбалкі праводзяцца штогод. Не ва ўсіх краінах існуюць умовы для лоўлі з лёду, таму ўдзельнікаў не вельмі шмат. Але трэба заўважыць, што беларускі чэмпіянат па колькасці каманд паўтарае харкаўскі рэкорд 2011 года». Што датычыцца прызавых, то федэрацыя прытрымліваецца меркавання, што гэта непрафесійны спорт, і таму грашовыя прызы ўдзельнікам не прадугледжаны. Сродкі выдзяляюцца толькі на прызавую атрыбутыку: медалі і кубкі.

Рэгламент спаборніцтваў наступны: пяць спартсменаў цягам трох гадзін рыбачаць у асобных сектарах, абмежаваных сцяжкамі. Злоўленая рыба звычайна знаходзіцца ў садку і адразу ж пасля ўзважвання выпускаецца. Але сёлета будзе зроблена выключэнне: улоў перададуць у Мінскі заапарк. Лавіць дазваляецца любую рыбу, але класці ў садок — не. У залік прымаюцца толькі асобіны, што дасягнулі пэўнага памеру. Некаторыя віды (як, напрыклад, фарэль, што занесена ў Чырвоную кнігу) павінны быць адразу ж адпушчаны ў вадаём. Трэба таксама адзначыць, што гендарных абмежаванняў на спаборніцтвах няма: у беларускім чэмпіянаце прыме ўдзел латвійская спартсменка Рыта Верзе-Грабоўскі, чэмпіёнка свету 2007 года.

Фота Анатоля КІПЕШЧУКА.

Паводле слоў **галоўнага трэнера зборнай Беларусі Яраслава ЦІХАНОВІЧА,** захапленне спартыўнай рыбалкай вымагае ад удзельнікаў весці здаровы лад жыцця. За тры гадзіны спартсмену трэба прасвідраваць, закарміць і апрацаваць каля 40 лунак, і чалавек у дрэннай фізічнай форме можа не справіцца з такой задачай.

Паназіраць за спаборніцтвамі можна будзе 22 і 23 лютага з 10 да 13 гадзін на грабным канале Заслаўскага вадасховішча. Уваход вольны.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ

ПАПУЛЯЦЫЮ ДЗІКА СКАРОЦЯЦЬ ДА 1 САКАВІКА

Пагалоўе дзіка ў Беларусі будзе зменшана да максімальна магчымага ўзроўню. Пра гэта падчас прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы паведаміў Сяргей ШАСТАКОЎ, начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі. Такое мерапрыемства звязана з эпідэміяй афрыканскай чумы свіней (АЧС).

Паводле слоў Сяргея Шастакова, размова пра поўную дэпапуляцыю дзіка ў Беларусі не ідзе. Вялікая частка папуляцыі знаходзіцца ў цяжкадаступных рэгіёнах. Дзік прыходзіць у Беларусь і з-за мяжы. Акрамя таго, гэта шматплодная жывёла, і яго папуляцыя даволі хутка аднаўляецца. На некаторы час знішчэнне паспрыяе актыўнаму размнажэнню іншых відаў: казулі, аленя. На 12 снежня мінулага года прыкладная колькасць дзіка ў Беларусі ацэньвалася ў 19,7 тысячы асобін.

Да 1 сакавіка паляўнічымі будзе здабыта 6,5 тысячы дзікоў. Выняцце праводзіцца пераважна праз адстрэл, забароненыя метады не выкарыстоўваюцца. Мяса дзіка, здабытае больш чым за 100 кіламетраў ад эпіцэнтраў АЧС, застаецца паляўнічым. У іншых выпадках яно ўтылізуецца.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

НА 700 КВАТЭР БОЛЬШ

Сёлета ў студзені на будаўніцтва жылля выкарыстана 1,9 трлн рублёў інвестыцый у асноўны капітал, што складае 21,2% да агульнага аб'ёму інвестыцый. Арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 5,6 тыс. новых кватэр (летась у студзені — 4,9 тысячы), паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Атрымліваецца, што сёлета мы пабудавалі на 700 кватэр больш, чым у студзені летась. Уведзена ў эксплуатацыю 448,5 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, што складае 9% да прадугледжанага задання на год і 110,1% да ўзроўню студзеня летась.

Для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 205,4 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, або 45,8% ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. З агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для чаргавікоў пабудавана: з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі — 166,5 тысячы квадратных метраў, у шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 151,3 тыс. кв. метраў.

У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 84,3 тысячы кв. метраў агульнай плошчы жылля, або 18,8% ад агульнага ўводу па рэспубліцы.

Сяргей КУРКАЧ.

У БРЭСЦЕ ПАБУДУЮЦЬ ХОСПІС

У бліжэйшыя два гады ў Брэсце запланавана пабудаваць хоспіс для людзей з цяжкімі анкалагічнымі хваробамі.

Пад хоспіс адведзены будынак былога дзіцячага садка ў адным з кварталаў прыватнай забудовы. Праектна-каштарысная дакументацыя павінна быць гатова ў красавіку.

Пакуль жа ў Брэсцкай вобласці ёсць толькі адзін хоспіс, адкрыты на базе ўчастковай бальніцы ў вёсцы Новая Мыш Баранавіцкага раёна.

Яна СВЕТАВА.

У МАГІЛЁВЕ «АРЫШТАВАЛІ» ВЯЛІКУЮ ПАРТЫЮ АДЗЕННЯ

Гэта адбылося падчас аператыўнай праверкі супрацоўнікамі падатковай інспекцыі і аддзела па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю Кастрычніцкага раёна Магілёва аднаго з прыватных гандлёвых прадпрыемстваў горада.

Як высветлілася, на жаночае адзенне з Расіі і Турцыі агульным коштам 3 мільярды рублёў не мелася суправаджальных дакументаў, якія б пацвердзілі яго бяспеку і якасць.

— Парушальнікам аказалася прадпрыемства, якое адкрылася ў студзені гэтага года,— падзялілася падрабязнасцямі намеснік начальніка інспекцыі МПЗ па Кастрычніцкім раёне Магілёва Марына Шаройкіна.— Небяспечны тавар яно планавала рэалізаваць у абласным цэнтры праз 15 сваіх магазінаў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ЗНОЎ ЗАБОЙСТВА ДЗЯЎЧЫНЫ Ў РЭЧЫЦЫ

Супраць дваіх жыхароў Рэчыцкага раёна завялі крымінальную справу па артыкуле аб забойстве. Як паведаміў начальнік упраўлення крымінальнага вышуку УУС Гомельскага аблвыканкама Віктар Чыкуноў, 16 лютага ў міліцыю з заявай аб знікненні дачкі звярнулася 45-гадовая жанчына. Дзяўчына двума днямі раней вечарам сышла з дому і не вярнулася.

Супрацоўнікі Рэчыцкага РАУС ва ўзаемадзеянні з калегамі з упраўлення крымінальнага вышуку УУС Гомельскага аблвыканкама па гарачых слядах выйшлі на аднаго знаёмага зніклай дзяўчыны. З ім 19-гадовая рэчычанка сустракалася, але апошнім часам узаемаадносіны пагоршыліся. Аператыўнікі ўсталявалі дачыненне да знікнення дзяўчыны не толькі яе хлопца, але і яго сябра, якіх адразу ж затрымалі. Малады чалавек прызнаўся, што падгаварыў знаёмага дапамагчы ў расправе над дзяўчынай.

Хлопцы сустрэлі сваю ахвяру ў горадзе, а потым вывезлі яе ў лес, дзе моцна збілі. Пасля гэтага, спрабуючы схаваць сляды злачынства, яны прывязалі да дзяўчыны мяшок з камянямі і кінулі цела ў штучны лясны вадаём. Прызначаны судова-медыцынская і шэраг крыміналістычных экспертыз, праводзіцца комплекс следчых дзеянняў, накіраваных на ўсталяванне матываў злачынства.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ОАО «Амкодор-Дзержинск»

222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19

ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится **24 марта 2014 г. в 15.00** по адресу: **Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19, актовый зал Общества.** Регистрация участников Собрания производится в день и по месту проведения Собрания **с 14.00 до 14.55.**

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, — **4 марта 2014 г.** Орган, созывающий Собрание: Совет директоров. Основание созыва Собрания — решение Совета директоров Общества **от 6 февраля 2014 года.** Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, — **4 марта 2014 г.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2013 год. Утверждение показателей прогноза социально-экономического развития Общества на 2014 год.

2. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2013 год.

3. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2013 год.

4. Утверждение направлений распределения прибыли на 2014 год.

5. Об избрании членов Совета директоров, Ревизионной комиссии.

6. Об утверждении размера вознаграждения членам Совета директоров.

С информацией (материалами), подлежащей представлению акционерам при подготовке к проведению Собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 17 марта 2014 г., в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения Собрания – по месту его проведения.

Участникам Собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (личный паспорт, для представителя акционера — доверенность или договор).

УНП 600005769 *Совет директоров ОАО «Амкодор-Дзержинск».*